

МУЖЧЫНЫ — ПРА СЯБЕ Ў ДЭКРЭЦЕ 7

ЯКІ КОШТ ВАКЦЫНАЦЫІ ЧАКАЕ СЁЛЕТА 11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ВЕРАСНЯ 2019 г. СЕРАДА № 177 (29044)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Беларусь ужо зрабіла свой выбар на карысць развіцця нацыянальнай ядзерна-энергетычнай праграмы, рэалізацыя якой дазволіць забяспечыць трэць патрэб краіны ў даступнай і надзейнай электраэнергіі, істотна скараціць выкіды парніковых газаў. Яна ўжо дала штуршок развіццю спадарожных галін і вытворчасцяў, навуковых ведаў. Для нашай краіны пытанні ядзернай бяспекі і транспарэнтнасці маюць абсалютны прыярытэт пры рэалізацыі ядзерна-энергетычнай праграмы. Гэтаму пытанню надаецца першараднае значэнне, актыўна выкарыстоўваецца найлепшая сусветныя практыкі і ўвесь даступны замежны вопыт».*

# Пачатак новай гісторыі адносін

## Беларусь і ЗША ўпершыню з 2008 года абмяняюцца пасламі



Фота БелТА.

**Аб гэтым падчас перагавораў з Прэзідэнтам Беларусі заявіў намеснік дзяржаўнага сакратара Злучаных Штатаў Амерыкі па палітычных пытаннях Дэвід Хэйл. Гэта не першы візіт у Мінск высокапастаўленых палітыкаў з ЗША. У канцы жніўня Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з Джонам Болтанам, дарадцам (ужо былым) па нацыянальнай бяспецы прэзідэнта ЗША. Нагадаем, тады кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сустрэча гістарычная, і прапанаваў пачаць адносіны краін з новага ліста. На тых перагаворах абмяркоўвалі розныя тэмы, але разам з тым да канкрэтных рашэнняў не прыйшлі. Прыезд Дэвіда Хэйла — чым не яшчэ адзін знак, што амерыканскі бок таксама згодны перагарнуць старонку і пачаць пісаць новую гісторыю двухбаковага ўзаемадзеяння?**

«Спадар Хэйл, прыемна вас бачыць тут — не толькі ў Беларусі, але і ва Усходняй Еўропе. Я з задавальненнем хачу адзначыць, што гэта сведчанне таго, што Злучаныя Штаты нарэшце звярнулі ўвагу не толькі на Еўропу ў цэлым, але і на Беларусь. У гэтыя складаныя часы ваш інтарэс да гэтага рэгіёна абнадзейвае», — вітаў Аляксандр Лукашэнка госця.

Прэзідэнт адзначыў, што Еўропа і планета ў цэлым перажывае няпростыя, складаныя часы і, бывае, ва ўскладненні абстаноўкі абвінавачваюць ЗША. «Але мы добра разумеем, што не бывае так у жыцці, каб адзін нехта быў вінаваты, — сказаў кіраўнік Беларусі. — Мабыць, тут мы ўсе вінаватыя, што складваецца такая сітуацыя ў свеце».

Візіт Дэвіда Хэйла дасць магчымасць беларусам і кіраўніцтву дзяржавы больш аб'ектыўна паглядзець на свет, зыходзячы з той інфармацыі, якую разлічвае атрымаць Аляксандр Лукашэнка ад госця.

Прэзідэнт паведаміў, што Беларусь як удзельніка Дагавора аб ракетах малой і сярэдняй далёкасці цікавіць надаўняя інфармацыя, што ні НАТА, ні Расія не збіраюцца размяшчаць у Еўропе гэтую зброю. «Я ў сваю чаргу нядаўна сказаў пра тое, што мы ні ў якім разе не будзем ініцыятарамі нядобрых спраў па разбурэнні гэтага Дагавора. І больш за тое, мы ніколі не станем такія ракеты размяшчаць на тэрыторыі Беларусі, калі не будзе пагрозы нашай бяспецы. Але і з Захаду, і з Усходу запэўніваюць мяне ў тым, што нам, Беларусі, не прыйдзецца прыбягаць да гэтых крайніх мераў. На гэта ў нас няма ні жадання, ні лішніх грошай, таму што гэта нятаннае мерапрыемства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Па палічках

# ЧАКАЦЬ НЕЛЬГА ЎКЛАСЦІ

## Ці атрымаюць беларусы дывідэнды з чэкаў «Маёмасць» і на што яны прыдатныя цяпер

**Ледзьве не ў кожнай сям'і дагэтуль ляжаць дзяржаўныя сертыфікаты з выявай Мірскага замка і Пагоні з надпісам «Маёмасць». Для большасці гэта ўжо, хутчэй, сувенір з мінулага, аднак многія яшчэ памятаюць, што каштоўныя паперы можна абмяняць на акцыі прадпрыемстваў. Некаторыя ж імкнуцца ўвогуле выменяць іх на грошы. Ці можна гэта зрабіць, куды ўкласці сертыфікаты і ці варта чакаць да 2021-га, калі тэрмін абарачэння чэкаў скончыцца і можна будзе атрымаць за іх ад дзяржавы кампенсацыю? Усе гэтыя пытанні хвалююць нашага чытача Антона Жука з Нясвіжскага раёна, які мае 121 чэк, і, думаю, будзе не лішнім нагадаць пра гэта іншым беларусам, на руках якіх засталося 40 % з выпушчаных 427 мільёнаў сертыфікатаў.**

### СЕРТЫФІКАТЫ — НА АКЦЫІ... «ПА ПРАПІСЦЫ» І СВАЯЦТВЕ

Чэкі «Маёмасць» з'явіліся ў Беларусі ў 1993 годзе падчас прыватызацыі. Да 1997-га іх маглі атрымаць ледзьве не ўсе паўналетнія беларусы і ўкласці паперы ў акцыі дзяржаўных прадпрыемстваў. Сертыфікаты атрымалі 4,9 мільёна чалавек, а 37 % беларусаў (2,9 млн), якія мелі правы на набыццё, не патурбаваліся зрабіць гэта.

СТАР. 2

КОРАТКА

• «Белкамунмаш» распрацаваў першы ў СНД праварульны электробус. Ён будзе прадстаўлены на выстаўцы Coach & Bus Live 2019 2—3 кастрычніка ў Бірмінгеме (Вялікабрытанія).



**• Панда Бін Двэнь Двэнь у касцюме з лёду стала афіцыйным талісманам зімовых Алімпійскіх гульняў 2022 года ў Пекіне.**



# Малы флот беларускіх вадаёмаў






Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## Якую лодку не трэба рэгістраваць

**Восень — час, калі на рэках і азёрах краіны пакрысе сціхае актыўнасць. Лодкі, катары і іншыя плавальныя сродкі адпраўляюцца на захоўванне да вясны. Таму можна ўжо цяпер падводзіць вынікі іх сезоннай эксплуатацыі. А заадно — і адказаць на пытанні тых, хто плануе набыць сабе штосьці для падарожжа па рэках і азёрах на наступны год. Пра ўсё гэта «Звяздзе» расказаў начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Міхаіл ЧАШУН.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!